# Да вынікаў вучэбнага года ў сетцы партыйнай асветы

Т. КІСЯЛЁЎ

Пытанні ідэйнага выхавання нашых кадраў, узбраення іх ведамі марксісцка-ленінскай тэорыі заўсёды стаялі і стаяць у цэнтры ўвагі большэвіцкай партыі і яе Цэнтральнага Камітэта. Ідэйнае ўзбраенне комуністаў — вярнейшы сродак умацавання боездольнасці партарганізацыі, узмацнення яе палітычнай і арганізатарскай ролі сярод працоўных. Ад узроўню марксісцка-ленінскай падрыхтоўкі нашых кадраў залежыць поспех рашэння любога пытання ў справе комуністычнага будаўніцтва. Таварыш Сталін вучыць: «Чым вышэй палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў любой галіны дзяржаўнай і партыйнай работы, тым вышэй і пладатворней сама работа, тым эфектыўней вынікі работы, і наадварот, — чым ніжэй палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў, тым больш магчымы зрывы і правалы ў рабоце, тым больш магчыма здрабненне і выраджэнне саміх работнікаў у дзяляг-крахабораў, тым больш магчыма іх перараджэнне» [1].

Практыка комуністычнага будаўніцтва вылучае перад нашымі кадрамі, партыйнымі, савецкімі, гаспадарчымі работнікамі, перад усёй савецкай інтэлігенцыяй новыя, усё больш велічныя задачы, паспяховае вырашэнне якіх патрабуе глыбокіх палітычных ведаў, высокага агульнакультурнага ўзроўню. У пастанове ЦК ВКП(б) аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» асаблівая ўвага звернута на тое, што «без ведання тэорыі марксізма-ленінізма, без авалодання большэвізмам, без пераадолення сваёй тэарэтычнай адсталасці, нашы кадры будуць кульгаць на абедзьве нагі, бо задача правільнага кіраўніцтва ўсімі галінамі соцыялістычнага будаўніцтва патрабуе авалодання з боку практыкаў асновамі марксісцка-ленінскай тэорыі, патрабуе ўмення кіравацца тэорыяй пры вырашэнні пытанняў практычнай дзейнасці» [2].

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) стварыў усе ўмовы для павышэння ідэйна-палітычнага ўзроўню ўсіх нашых кадраў, авалодання імі марксісцка-ленінскай тэорыяй. Створана стройная сістэма партыйнай асветы. Велізарнымі тыражамі выдаецца марксісцка-ленінская і іншая палітычная літаратура. За гады савецкай улады ў краіне выдана 847 мільёнаў экземпляраў твораў класікаў марксізма-ленінізма. За апошнія гады вышлі ў свет 35 тамоў чацвертага выдання Твораў В. І. Леніна і 13 тамоў Твораў І. В. Сталіна.

Творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна перакладаюцца і выдаюцца на 119 мовах народаў СССР. У гэтым годзе будзе завершан пераклад і выданне на беларускай мове 35 тамоў Твораў В. І. Леніна і ўсіх вышаўшых на рускай мове тамоў Твораў І. В. Сталіна. Магутнай ідэйнай зброяй большэвізма з'яўляецца сталінскі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» — энцыклапедыя асноўных ведаў у галіне марксізма-ленінізма. Мільёны людзей вывучаюць біяграфіі правадыроў працоўных усяго свету — Леніна і Сталіна. Неацанімае значэнне для павышэння палітычнага

---

[1] **І. Сталін.** Пытанні ленінізма, стар. 598, 11-е выд.
[2] ВКП(б) у рэзалюцыях, стар. 680, ч. II, выд. 6-е.

ўзроўню ўсіх нашых кадраў, для ўздыму ўсёй ідэалагічнай работы маюць выдатныя працы таварыша Сталіна па пытаннях мовазнаўства, якія з'яўляюцца далейшым узбагачэннем і развіццём марксісцка-ленінскай тэорыі.

ЦК ВКП(б), за апошнія гады прыняў рад пастаноў па пытаннях ідэалагічнай работы і пытаннях партыйнай прапаганды. Гэтыя рашэнні ўказалі канкрэтныя шляхі ўзмацнення ідэалагічнай і прапагандысцкай работы партыйных арганізацый і адыгралі вялікую ролю ва ўздыме гэтай работы. Партыйныя арганізацыі КП(б) Беларусі, кіруючыя рашэннямі і ўказаннямі ЦК ВКП(б) па пытаннях партыйнай асветы, у мінулым вучэбным годзе правялі значную работу па прапагандзе марксісцка-ленінскай тэорыі, па ідэйна-палітычнаму выхаванню комуністаў, інтэлігенцыі і беспартыйнага актыва з рабочых і калгаснікаў. Вынікі мінулага вучэбнага года ў сістэме партыйнай асветы паказалі, што нашы кадры, партыйныя, совецкія і гаспадарчыя работнікі пачалі больш глыбока і сістэматычна працаваць над вывучэннем гісторыі і тэорыі большэвіцкай партыі і значна павысілі свой ідэйна-палітычны ўзровень.

У 1950/51 вучэбным годзе ў рэспубліцы працавала 13 вячэрніх універсітэтаў марксізма-ленінізма, 257 вячэрніх партыйных школ, 5000 гурткоў па вывучэнню гісторыі ВКП(б) асноўнага і павышанага тыпу, 426 тэарэтычных семінараў партактыва, 2878 палітшкол першага і другога года навучання, 1484 гурткі па вывучэнню біяграфій правадыроў комуністычнай партыі В. І. Леніна і І. В. Сталіна. Звыш 30 тысяч комуністаў самастойна вывучалі гісторыю і тэорыю большэвіцкай партыі.

Усяго сістэмай партыйнай асветы было ахоплена звыш 180 тыс. комуністаў і беспартыйных. Апрача гэтага каля 40 тысяч членаў і кандыдатаў у члены ВКП(б) займалася завочна ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, 1402 партыйныя і совецкія работнікі — у рэспубліканскай партыйнай школе і на 9-месячных курсах, 420 кіруючых работнікаў рэспублікі навучаецца ў ЗВПШ пры ЦК ВКП(б). Значная колькасць комуністаў займалася ў вячэрніх агульнаадукацыйных школах.

Вельмі станоўчым з'яўляецца тое, што ў мінулым вучэбным годзе значна ўзрос лік комуністаў, вывучаючых «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» з прыцягненнем твораў класікаў марксізма, а таксама значнае павелічэнне ліку палітшкол, у якіх разам з комуністамі павышаў свой ідэйна-палітычны ўзровень беспартыйны актыў.

Выходзячы з указанняў ЦК ВКП(б) аб тым, што прапагандыст з'яўляецца цэнтральнай фігурай у партыйнай асвеце, партыйныя арганізацыі правялі значную работу па падбору і выхаванню прапагандыстаў. Да вядзення прапагандысцкай работы было прыцягнута 14303 комуністы, якія любяць і ведаюць гэтую справу, здольны забяспечыць належны ўзровень заняткаў у сістэме партыйнай асветы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы